грамадска-палітычная газэта

# >РУХ у Еўропу>

№9(09) лістапад 2011г.

СТРУКТУРЫ ЕС

## ЕЎРАПЕЙСКІ ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ БАНК

**Еўрапейскі інвестыцыйны банк – дзяржаўная фінансава-крэдытная ўстанова Еўрапейскага звяза для фінансавання развіцця адсталых еўрапейскіх рэгіёнаў у форме доўгатэрміновых крэдытаў. Створаны ў 1958 годзе з мэтай выдавання крэдытаў для збудавання і рэканструкцыі аб'ектаў, якія ўяўляюць цікавасць для краінаў ЕС.**

Статутны капітал фармуецца з унёскаў краін-удзельніц і складае 232,393 млрд еўра. ЕІБ з'яўляецца юрыдычнай асобай. Яго сябрамі з'яўляюцца дзяржавы - чальцы Супольнасці. Задача ЕІБ заключаецца ў спрыянні "сталага і збалансаванага развіцця агульнага рынка ў інтарэсах Супольнасці". Для дасягнення гэтай мэты ён выкарыстоўвае як рэсурсы рынка капіталаў, да якіх мае доступ, так і ўласныя рэсурсы. Банк падае крэдыты і гарантыі для рэалізацыі такіх праектаў:

- па развіцці слабаразвітых рэгіёнаў;
- накіраваных на мадэрнізацыю ці перайтварэнне прадпрыемстваў ці на развіццё новых відаў дзейнасці, якія б спрыялі прагрэсу ў стварэнні агульнага рынка;
- якія складаюць агульную цікавасць для некалькіх дзяржаў-чальцоў, і якія за сваім аб'ёмам ці прыродай не могуць быць цалкам фінансава асобнымі дзяржавамі-чальцамі.

За кошт выпуску аблігацыйных пазык на міжнародным грашовым рынку і на нацыянальных грашовых рынках краінаў Еўрапейскага звяза фармуюцца прыцягнутыя сродкі банка. На рэнтабельныя праекты падаюць звычайныя крэдыты, на маларэнтабельных – палёгкавыя. Да 70% прыпадае на крэдыты для рэгіянальнага развіцця меней развітых раёнаў. Агульная сума прадстаўленых крэдытаў – звыш 47 млрд. еўра. Пазыкі банка пакрываюць частку кошту праекта, дапаўняючы ўласныя капіталы пазычальніка (як правіла менш 50%).

Сферы выкарыстання крэдытаў – энергетыка, транспарт і тэлекамунікацыі. Еўрапейскі інвестыцыйны банк выдае таксама палёгкавыя крэдыты за кошт сродкаў ЕС як тэхнічны распарадчык. Крэдыты банка падаюцца ў некалькіх валютах. Адсоткавая стаўка па "змяшаных" крэдытах вызначаецца на базе сярэднеўзважаных коштаў прыцягнутых сродкаў у дадзеных валютах на міжнародных ці нацыянальных рынках капіталаў.



Кіроўныя органы Еўрапейскага інвестыцыйнага банка – Рада кіраўнікоў, Дырэктарат і Кіраванне. У Раду кіраўнікоў уваходзяць міністры фінансаў краінаў ЕС. Ён вызначае агульную крэдытную палітыку, разглядае і сцвярджае гадавыя балансы, уносіць змены ў статутны капітал. Дырэктарат прымае рашэнне пра падаванне крэдытаў і гарантый пры прыцягненні сродкаў, усталяванні адсоткавых ставак. Аператыўнае кіраўніцтва ажыццяўляюць прэзідэнт і пяць яго намеснікаў.

Месцазнаходжанне Еўрапейскага інвестыцыйнага банка - Еўрапейскі квартал Люксембурга.

# ДАНІЯ

**Данія – канстытуцыйная манархія, дзе Каралева выконвае ролю кіраўніка дзяржавы, а ўрад фармуецца з парламента, ці "фолкецінга".**

Парламент у Даніі аднапалатны; дэпутаты абіраюцца шляхам прапарцыйнага прадстаўніцтва, хоць кожны член парламента таксама прадстаўляе выбарчую акругу. Агульная колікасць дэпутатаў – 179. Ад Грэнландыі і Фарэрскіх выспаў абіраецца чатыры дэпутаты.

Увогуле, Урад Даніі з'яўляецца ўрадам меншасці. Гэта азначае, што палітыка Даніі заснавана на кампрамісах розных палітычных партый. У выпадку, калі Фолкецінг выказвае недавер ураду, то ўрад павінен сысці ў адстаўку ці правесці выбары.

Па Канстытуцыі выбары павінны праходзіць кожныя 4 гады. Калі размеркаванне месцаў пасля выбараў выразна паказвае на вызначаную партыю ці партыі, манарх прызначае іх як урад. У выпадку, калі вынік выбараў не ўяўляецца выразным, Каралева арганізуе шэраг нарад, на якіх абраныя партыі выказваюць свае пажаданні. Тады Каралева прызначае каралеўскага паверанага, каб той правёў перамовы пра фармаванне ўрада з абранымі партыямі. Па выніках перамоваў праводзіцца яшчэ адна нарада на чале з Каралевай, пасля якога манарх прызначае новага прэм'ер-міністра.



**Адміністрацыйнае дзяленне Даніі**

Адміністрацыйна Данія падзяляецца на 14 амтаў і 2 гарадскія камуны (Капенгаген і Фрэдэрыксберг) з адмысловым статутам. Імі кіруюць мясцовыя органы ўлады – рады, абіраныя тэрмінам на чатыры гады. Рады апякуюцца дарогамі, аховай здароўя і народнай адукацыяй. Ніжэйшую прыступку адміністрацыйнага дзялення займаюць камуны, ці абшчыны (іх налічваецца 275) і муніцыпалітэты. У іх кампетэнцыю ўваходзяць планаванне забудовы тэрыторыі і сацыяльнае забеспячэнне насельніцтва.

**Судовая ўлада**

Звычайна справы разглядаюцца ў першую чаргу мясцовым ці гарадскім судом; апеляцыі па рашэнні гарадскога суда разглядаюцца ў адным з двух Высокіх Судоў краіны. Некаторыя важныя справы, якія закранаюць адміністрацыйныя праблемы, разбіраюцца адным з Высокіх Судоў у першую чаргу. Вышэйшым органам судовай улады з'яўляецца Вярхоўны Суд. Суддзяў прызначае Каралева.

**НАТА**

Данія шмат зрабіла для таго, каб падтрымаць НАТА як асноўны сродак дасягнення палітычнай бяспекі ў Еўропе, і для Даніі асабліва важна, што ЗША з'яўляецца актыўным чальцом НАТА. У вобласці палітыкі бяспекі Данія займае пазіцыі блізкія ЗША. Данія таксама з'яўляецца чальцом Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

**Данія ў ЕС**

Данія, разам у Вялікабрытаніяй, Нарвегіяй і Ірландыяй, падалі заяўкі на чалецтва ў Еўрапейскім Звязе ў 1961 і 1967 гадах. Аднак у абодвух выпадках прэзідэнт Францыі Шарль дэ Голль наклаў вета на чалецтва Вялікабрытаніі ў ЕС, і Данія, не жадаючы ўступаць у Звяз без Вялікабрытаніі, таксама засталася па-за Еўрапейскім Звязам. Толькі ў студзені 1973 г. Данія разам з Вялікабрытаніяй і Ірландыяй стала чальцом ЕС.

**Рэлігія ў Даніі**

Рэлігійная дзейнасць краіны падпарадкоўваецца Канстытуцыі Даніі, асноўным прынцыпам якой з'яўляецца перадумова, што Лютэранская царква – афіцыйная царква Даніі – павінна падтрымлівацца дзяржавай, а таксама прынцыпам свабоды веравызнання, слова і сумлення.

**Скандынаўская мадэль дабрабыту**

Скандынаўская мадэль дабрабыту часта выкарыстоўваецца як агульны тэрмін для апісання таго, як Данія, Швецыя і Нарвегія арганізуюць і фінансуюць свае сістэмы сацыяльнай падтрымкі, праграмы здароўя і адукацыі. Прынцып, які ляжыць у аснове гэтай мадэлі, складаецца ў тым, што дапамога павінна падавацца ўсім грамадзянам, на якіх яна распаўсюджваецца, незалежна ад іх сацыяльнага ці сямейнага статуту. Гэта сістэма ўніверсальная, і дапамога падаецца кожнай асобе паасобку, так, напрыклад, замужняя жанчына мае правы незалежна ад свайго мужа. Што да аховы здароўя і занятасці, то права на атрыманне дапамогі залежыць ад месца працы і часцяком ад чалецтва ў прафзвязе і памеру чалецкіх унёскаў. Але ўсё ж найвялікшая доля фінансавання ляжыць на дзяржаве і ажыццяўляецца пасродкам сістэмы падаткаабкладання, якая характарызуецца шырокім ахопам і высокім узроўнем, а не пры дапамозе адмысловых датацый.

**Адукацыя**

Сістэма адукацыі ў Даніі забяспечваецца або мясцовымі folkeskole (бясплатныя

# ДАНІЯ

агульнаадукацыйныя школы), або прыватнымі агульнаадукацыйнымі школамі, якія маюць тую ж структуру. Folkeskole складаецца з пачатковага класа і дзевяці класаў агульнай школы плюс адзін клас дзясяты. Пачатковы клас і дзясяты клас не адносяцца да абавязковай адукацыі, але амаль усе дзеці наведваюць пачатковы клас, і каля паловы вучняў дзявятага класа пераходзяць у дзясяты.

Folkeskole з'яўляецца адзінай школай, у якой няма падзелу па ўзроўнях. Праграма вызначаецца Законам пра сярэднюю адукацыю. Па заканчэнні дзявятага і дзясятага класаў вучні могуць, калі жадаюць, здаваць выпускныя іспыты folkeskole.

У плане альтэрнатывы замест апошніх класаў школы, вучні могуць перайсці ў efterskoler (дадатковая школа), якая з'яўляецца прыватным пансіянатам для дзяцей ад 14 да 18 гадоў. У 1992 г. у такіх школах займалася 10,6 % вучняў апошніх трох класаў. Як дадатак да folkeskole вучні ў гэтай узроставай групе могуць таксама наведваць мясцовыя дзённыя дадатковыя школы для агульнага развіцця з акцэнтам на практычных занятках і грамадскіх прадметах.

**Сям'я**

Пачынальна з шасцідзесятых гадоў сям'я ў Даніі зведала змены: лік шлюбаў паменшыўся, лік пар, якія пражываюць сумесна па-за рэгестраваным шлюбам – павялічылася. Павялічыўся таксама і ўзрост уступлення ў шлюб. У 1995 г. ён склаў 35 гадоў для мужчынаў і 33 г. для жанчынаў.

Сярэдні памер дацкай сям'і – 2,2 чалавекі і нягледзячы на радыкальныя змены ў структуры сям'і, у 1997 г. 3/4 ліку дзяцей да 18 гадоў пражывалі з абодвума роднымі бацькамі. У апошні час назіраецца тэндэнцыя павелічэння колькасці дзяцей, якія жывуць з адным з бацькоў.

*Danes.ru*

# ЛИДЕРЫ ФРАНЦИИ И ГЕРМАНИИ ПРЕДЛАГАЮТ СОКРАТИТЬ ЗОНУ ЕВРО

**Париж и Берлин рассматривают идею переформатирования еврозоны.**



Подразумевается усиление процессов интеграции, а также сокращение числа участников валютного блока.

Агентство **Reuters** сообщает, что между Францией и ФРГ в последние месяцы проходил активный переговорный процесс на всех уровнях относительно реформирования зоны евро. По словам источника, этот вопрос необходимо решать очень осторожно, однако нужно определиться со странами, которые не хотят или не могут сохранять членство в еврозоне.

На данном этапе эта тема пока не получила развития и остается на уровне обмена мнениями. Эксперты уверены, что и многие государства-члены Евросоюза не воспримут настолько радикальный пересмотр евроинтеграционной модели.

На прошедшем недавно саммите «Большой двадцатки» **Ангела Меркель** и **Николя Саркози** впервые озвучили мысль, что состав зоны евро может покинуть Греция.

*focus.ua*

# ГЕРМАНИИ НЕ ХВАТАЕТ РАБОЧИХ РУК

**В Германии, экономика которой стремительно развивается, при этом отмечают нехватку квалифицированных рабочих.**



Поэтому власти страны рассматривают вариант приглашения на работу жителей Греции, Португалии и Испании, где, напротив, кризис вызвал существенный рост безработицы. В то же время в самой Германии уровень безработицы составил 6,6%, что является самым низким показателем за последние два десятка лет.

Точных данных о том, сколько на данный момент рабочих-иностранцев и с каких стран наняли немецкие компании, нет, однако косвенные данные из разных источников показывают, что на протяжении последних пяти лет количество иммигрантов в ФРГ увеличилось на тринадцать процентов.

*Associated Press*

# ПАРЭ ХВАЛЮЕ СЫТУАЦЫЯ ВАКОЛ САНЬНІКАВА

**Дакладчык Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы па Беларусі, эстонскі дэпутат Андрэс Хэркель выказаў глыбокую заклапочанасьць сытуацыяй вакол асуджанага кандыдата ў прэзыдэнты на выбарах-2010 Андрэя Саньнікава, паведаміла прэс-служба ПАСЕ.**

"Я атрымліваю рэгулярныя справаздачы аб жорсткім абыходжаньні і катаваньнях зьняволеных, таму настойліва заклікаю беларускія улады неадкладна праінфармаваць сям'ю і адвакатаў спадара Саньнікава пра яго месцазнаходжаньне і забясьпечыць доступ да яго", — заявіў 16 лістапада Хэркель.

6 лістапада сваю заяву таксама зрабілі дэпутатка нямецкага парлямэнту Бундэстагу ад партыі зялёных Марылюіза Бэк

«Андрэй Саньнікаў чарговым разам зьнік зь беларускай турмы. Сваякам і адвакатам адмоўлена ў тым, каб ведаць яго цяперашняе месцазнаходжаньне і акалічнасьці зьнікненьня. Шматлікія зьвесткі пра жорсткае абыходжаньне і катаваньні, каб палітычныя зьняволеныя прызналі сваю віну, прымушаюць думаць пра горшае.

Мы вельмі занепакоеныя лёсам Саньнікава.

Мы заклікаем беларускі ўрад неадкладна інфармаваць сваякоў і адвакатаў Андрэя Саньнікава пра яго месцазнаходжаньне і гарантаваць сустрэчу зь ім».

*Радыё Свабода*

# ЭЎРАЗЬВЯЗ ПАТРАБУЕ ВЫЗВАЛЕННЯ БЯЛЯЦКАГА

**Прадстаўніца Эўрапейскага зьвязу па міжнародных справах і бясьпецы Кэтрын Эштан і эўракамісар па палітыцы эўрапейскага суседзтва Штэфан Фюле зьвярнуліся да беларускіх уладаў з заявай, у якой запатрабавалі неадкладна і безумоўна вызваліць праваабаронцу Алеся Бяляцкага.**

"Мы заклікаем Беларусь неадкладна і без усялякіх умоваў вызваліць Бяляцкага і спыніць справу ў дачыненьні да яго намесьніка Валянціна Стэфановіча (...) Мы сур'ёзна занепакоеныя затрыманьнем і крымінальным перасьледам вядомага беларускага праваабаронцы і высунутымі супраць яго беспадстаўнымі абвінавачваньнямі ў няспалаце падаткаў", гаворыцца ў заяве.

23 лістапада пракурор Сайкоўскі папрасіў пакараць Алеся Бяляцкага 5 гадамі калёніі ўзмоцненага рэжыму і сканфіскаваць маёмасьць. Адвакат Лаеўскі папрасіў цалкам апраўдаць падабароннага. Сам Бяляцкі заявіў, што ня лічыць сябе вінаватым і што справа супраць яго палітычна матываваная.

Прысуд Алесю Бяляцкаму абвесьцяць 24 лістапада аб 11-й гадзіне.

Суд над Алесем Бяляцкім пачаўся 2 лістапада.

Алеся Бяляцкага вінавацяць ва ўхіленьні ад сплаты падаткаў у асабліва буйных памерах з грошай, якія ішлі на праваабарончую дзейнасьць.

Бяляцкаму пагражае да 7 гадоў зьняволеньня з канфіскацыяй маёмасьці.

Банкаўскія дадзеныя Бяляцкага афіцыйнаму Менску перадалі Літва і Польшча.

Бяляцкага затрымалі 4 жніўня. Яго ўтрымліваюць у турме на вуліцы Валадарскага ў Менску.

*www.svaboda.org*

# НЯМА ДАВЕРУ ДА БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІКІ

**Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Standard & Poor's перавяло Беларусь і яе банкаўскі сэктар на найніжэйшую, 10-ю прыступку шкалы, паводле якой ацэньваюцца рызыкі банкаўскага сэктару (Banking Industry Country Risk Assessment, BICRA).**



S & P разьлічвае рызыкі BICRA па шкале ад "1" да "10", дзе "1" - найменшы ўзровень рызыкі, "10" - найбольшы. Акрамя Беларусі, да групы "10" адносяцца Віетнам і Грэцыя.

"У адпаведнасьці з нашымі крытэрамі, ацэнка эканамічнай рызыкі "10" адлюстроўвае наша меркаваньне аб тым, што краіна падвяргаецца выключна высокай рызыцы ўзьнікненьня эканамічных дысбалянсаў, выключна высокай крэдытнай рызыцы ў эканоміцы і вельмі высокай рызыцы парушэньня эканамічнай устойлівасьці", - паведамляецца ў прэс-рэлізе агенцтва.

Экспэрты агенцтва таксама падкрэсьліваюць высокую палітычную рызыку ў краіне. "Высокая палітычная рызыка ў Беларусі зьніжае прадказальнасьць палітыкі, а магчымыя зьмены ў складзе цэнтралізаванай ўлады могуць прывесьці да эканамічнага ўзрушэньня або абвастрыць яго", - адзначаецца ў паведамленьні.

*www.svaboda.org*

# БЯЛЯЦКАГА НА НОБЕЛЕЎСКУЮ ПРЭМІЮ МІРУ

**Міністр замежных спраў Літвы абяцае вылучыць Бяляцкага на Нобелеўскую прэмію міру.**

«Стаўленне да Бяляцкага з'яўляецца яркім прыкладам праследу ўладамі грамадзянскай супольнасці», — гаворыцца ў заяве Рады Еўропы. Рада Еўропы асуджае прысуд, вынесены 24 лістапада беларускаму праваабаронцу Алесю Бяляцкаму. Пра гэта гаворыцца ў заяве генеральнага сакратара арганізацыі **Турб'ерна Ягланда**.

«Я рашуча асуджаю суровы прыгавор праваабаронцу Алесю Бяляцкаму, вынесены нібыта за ўхіленне ад выплаты падаткаў, — сказаў Ягланд. — Стаўленне да Бяляцкага з'яўляецца яркім прыкладам праследу ўладамі арганізацый грамадзянскай супольнасці, асабліва пасля прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня 2010 года».

Ягланд падкрэсліў, што Бяляцкі павінен быць «вызвалены без усякіх умоў, як і ўсе іншыя палітзняволеныя». Акрамя таго, адзначыў генеральны сакратар Рады Еўропы, не павінна быць перашкод для далейшай дзейнасці Бяляцкага па абароне правоў чалавека ў Беларусі.

Вызваліць Бяляцкага заклікалі Вялікабрытанія, Германія, ПАСЕ, АБСЕ, Еўрапарламент, Міжнародная федэрацыя правоў чалавека ды інш.

Міністр замежных спраў Літвы **Аўдронюс Ажубаліс** сёння асудзіў прысуд Бяляцкаму і заявіў, што ён вылучыць Алеся Бяляцкага на Нобелеўскую прэмію міру. Гэта вельмі важная заява, якая павялічыць шанцы Бяляцкага на атрыманне гэтай важнай прэміі.

Алесь Бяляцкі — віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека, кіраўнік закрытага ўладамі праваабарончага цэнтра «Вясна» — прыгавораны да чатырох з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Такое рашэнне абвясціў 24 лістапада суддзя суда Першамайскага раёна Мінска Сяргей Бандарэнка.

Бяляцкі прызнаны вінаватым па частцы 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса (утойванне даходаў у асабліва буйным памеры). У ходзе суда праваабаронца патлумачыў, што адкрыў банкаўскія рахункі за мяжой, бо зрабіць гэта ў Беларусі не ўяўлялася магчымым. Праваабарончы цэнтр «Вясна», які ён узначальвае, быў закрыты ўладамі ў 2003 годзе, а на шматлікія спробы праваабаронцаў легалізаваць сваю арганізацыю Мінюст адказваў адмовай. Грошы, якія пералічваліся на рахункі Бяляцкага, выкарыстоўваліся для аказання дапамогі ахвярам палітычных рэпрэсій у Беларусі.

*БелаПАН*

# ЛІТВА СПЫНЯЕ ЎСЕ КАНТАКТЫ З БЕЛАРУССЮ

**У Літвы няма і не будзе ніякіх палітычных кантактаў, прававых дамоваў і абмену дэлегацыямі з Беларуссю. Пра гэта заявіў міністр юстыцыі Літвы Рэмігіюс Шымашус, каментуючы вынесены 24 лістапада прысуд кіраўніку праваабарончага цэнтра "Вясна" Алесю Бяляцкаму.**



Рэмігіюс Шымашус адзначыў, што дрэнна ацэньвае прысуд, таму што "ў ім многае сведчыць пра тое, што гэта палітычна матываваны працэс, а не юрыдычная працэдура".

Пры гэтым літоўскі міністр дадаў, што звесткі, атрыманыя ад Літвы, былі адкліканы, і ніхто не меў права выкарыстоўваць іх у судовым працэсе. Аднак яны выкарыстоўваліся, дадаў ён.

Акрамя таго, Рэмігіюс Шымашус адзначыў, што пасля выпадку з Алесем Бяляцкім ў Літве зроблена ўсё, каб падобнае не паўтарылася.

Літва вылучыць кандыдатуру Бяляцкага на Нобелеўскую прэмію

У сваю чаргу кіраўнік літоўскага МЗС Аўдронюс Ажубаліс заявіў, што Літва будзе вылучаць кандыдатуру Бяляцкага на атрыманне Нобелеўскай прэміі міру.

Пры гэтым ён таксама выказаў шкадаванне, што афіцыйны Мінск падобным чынам выкарыстаў атрыманыя ад Літвы звесткі. "Я ўпэўнены, што імя Бяляцкага ў найбліжэйшай будучыні стане такім сімвалам свабоды і дэмакратыі, як імя бірманкі Аун Сан Су Чжы, паўднёваафрыканца Нэльсана Мандэлы, расійца Андрэя Сахарава", - сказаў ён, дадаўшы, што "з такімі сімваламі, як паказвае практыка і гістарычны вопыт, рэжымам змагацца проста безнадзейна".

Як ужо перадаваў Тэлеграф, суд Першамайскага раёна Мінска 24 лістапада прызнаў Алеся Бяляцкага вінаватым ва ўхіленні ад выплаты падаткаў і прысудзіў да 4,5 гады турмы з канфіскацыяй маёмасці.

Прысуд кіраўніку "Вясны" асудзілі краіны Еўрасаюза і ЗША, а таксама буйныя міжнародныя праваабарончыя арганізацыі. У сваю чаргу МЗС Беларусі негатыўна ацаніў падобную рэакцыю заходніх краін на прысуд. "Заклікі да адвольнай адмены судовага рашэння дэманструюць вельмі выбарчы прававы нігілізм і проста цынізм іх аўтараў", - заявілі ў МЗС.

Акрамя таго, з патрабаваннем вызваліць Бяляцкага выступілі лідары беларускіх апазіцыйных палітычных партый.

*telegraf.by*

# ПРАЦУЕ “ОФІС ЗА ДЭМАКРАТЫЧНУЮ БЕЛАРУСЬ”

**Інтэрв'ю з Вольгай Стужынскай – заснавальніцай “Офісу за дэмакратычную Беларусь” у Брусэлі.**

Ці ведаеце вы, што ў самым сэрцы Еўропы, усяго ў трох хвілінах хады ад Еўрапейскага парламенту знаходзіцца прадстаўніцтва Беларусі? Дакладней, прадстаўніцтва беларускай грамадзянскай супольнасці і называецца яно “Офіс за дэмакратычную Беларусь”. Больш за 5 гадоў гэтая няўрадавая арганізацыя тлумачыць еўрапейскім палітыкам, што адбываецца па той бок “Шэнгенскага муру” ды намагаецца зрабіць Еўропу больш даступнай і зразумелай для беларусаў. Мы прапануем вашай увазе размову са стваральніцай “Офісу за дэмакратычную Беларусь” Вольгай Стужынскай.



**Вольга Стужынская**, выпускніца Коласаўскага ліцэю, дачка вядомага гісторыка Ніны Стужынскай, прыехала ў Брусель у 2001 годзе. Студэнтка эканамічнага факультэту БДУ плянавала пражыць у сталіцы Еўропы паўгода, але не ведала, што застанецца тут больш чым на 10 гадоў і зробіць бліскучую кар’еру.

В. Стужынская: Я ехала сюды па праграме “Au Pair” – даглядаць дзяцей сям’і дыпламатаў, якія раней працавалі ў Беларусі. Гэта была сям’я, з якой мы сябравалі яшчэ ў Мінску. Яны запрасілі мяне прыехаць у Брусель на паўгода. І вось ужо 10 гадоў, як я тут. Я скончыла Мэрылэндзкі ўніверсытэт у Брусэлі, стажыравалася ў Еўрапейскім парламенце. Потым амаль 2 гады працавала ў Парламенцкай асамблеі NATA, а ў 2006 годзе мы зарэгістравалі “Офіс за дэмакратычную Беларусь”.

Стварыць арганізацыю, якая б распавядала эўрапейскім чыноўнікам пра Беларусь, Вольга Стужынская вырашыла пасьля драматычных выбараў 2006 году. Эўрапейскія палітыкі тады абсалютна ня ведалі й не разумелі, што адбываецца ў Менску – прызнаецца Вольга Стужынская.

В. Стужынская: Інфармацыйная роля была тады галоўнай. Таксама мы дапамагалі прадстаўнікам беларускіх палітычных партыяў, грамадзкіх арганізацыяў, СМІ ладзіць візіты ў Брусель, выступы ў Еўрапейскім парламенце, закрытыя спатканьні.

2008-2010 гады – гэта час славутай лібералізацыі. Мы пачалі весці праекты, ў якіх удзельнічалі таксама і прадстаўнікі розных беларускіх міністэрстваў. Як прыклад можна назваць праграму “Беларусь і ЕС: дзелімся досведам”. Спадзяемся, што мы здолеем працягуць гэты праект і ў будучым годзе. Сёння мы рэалізуем вялікі праект “EU-Belarus Task Force”, які ўключае ў сябе як інфармацыйную кампанію, так і кансультацыйныя сустрэчы, а таксама кампанію па зніжэнні коштаў візаў, якую мы вядзем не першы год.

Як жа фінансуецца “Офіс за дэмакратычную Беларусь”? Ніякіх сакрэтаў няма – кажа Вольга Стужынская.

В. Стужынская: Спачатку гэта былі невялікія гранты ад абсалютна розных фондаў. Цяпер фінансаванне набыло сталы характар – бо арганізацыі ўжо даволі шмат гадоў і яна добра сябе зарэкамэндавала. Мы атрымліваем фінансаваньне ад Еўрапейскай камісіі. Таксама мы падтрымліваем супрацоўніцтва з урадамі Швецыі й Даніі. Невялікая частка фінансавання ідзе ад амерыканскага ўраду, але яно мінімальнае.

Як прызнаецца дырэктарка “Офісу за дэмакратычную Беларусь”, ні беларуская амбасада ў Брусэлі, ні ўлады ў Мінску не перашкаджаюць дзейнасці арганізацыі. Афіцыйная і неафіцыйная амбасады суіснуюць мірна. Аднак пасля 19 снежня пэўнасці ў тым, што ўсе запланаваныя праекты будуць рэалізаваныя, на жаль, няма – канстатуе Вольга Стужынская.

А што ж пра нас думае Еўропа? Еўрасаюз стаміўся і проста не ведае што рабіць зь Беларуссю. Ні пуга, ні пернік ніякіх эфектаў не далі – кажа Вольга Стужынская.

В. Стужынская: Эўразьвяз спрабаваў як ізаляваць, так і весьці дыялёг зь Менскам. А вынік – мінімальны. Сёння ЕС пачынае разумець, што патрэбны дыялёг з шырокай часткай беларускага грамадзтва, якая не прадстаўлена ні ўладай, ні палітычнай апазыцыяй. З большай часткай беларускага грамадзтва дыялёг не вядзецца, бо яна нікім не прадстаўлена. У бліжэйшай будучыні мы арганізуем круглы стол з удзелам беларускіх і міжнародных экспэртаў, а таксама прадстаўнікоў Эўрапейскай камісіі,

## ПРАЦУЕ “ОФІС ЗА ДЭМАКРАТЫЧНУЮ БЕЛАРУСЬ”

такіх як камісар Фюле. Мэтай сустрэчы будзе выпрацаваць новыя рэкамэндацыі наконт таго, як будаваць дыялёг зь Беларусьсю. Не трэба праводзіць дыялогу толькі з уладамі, альбо дыялогу толькі з палітычнай апазіцыяй. Еўропа павінна пашукаць шляхі супрацоўніцтва з большай часткай беларускага грамадства.

Нягледзячы на тое, што ў Брусэлі Вольга Стужынская працуе ўжо 10 гадоў, на Радзіму яна ездзіць вельмі часта і добра разумее, што адбывецца дома.

В. Стужынская: Я бываю ў Мінску амаль кожны месяц. Я лічу гэта вельмі важнай часткай сваёй працы. Я езджу, каб разумець, што адбываецца ў краіне, каб мець мажлівасць размаўляць з прадстаўнікамі самых розных групаў, каб адсочваць нават невялікія змены і тэндэнцыі, каб правільна рабіць аналіз сітуацыі і правільна тлумачыць яе ў Брусэлі.

Ці ёсць у сэрцы Еўропы іншыя беларусы? Вядома, ёсць, але разам не трымаюцца – прызнаецца Вольга Стужынская.

В. Стужынская: Беларусы не шукаюць адзін аднаго. Бывае вельмі дзіўна, калі твае сябры-замежнікі пытаюць: “Ведаеш, у банку за вуглом працуе аналітык? Ён беларус. Вы не знаёмыя?” Я была ў тым банку й нават размаўляла з гэтым чалавекам, ён ведаў, што я зь Беларусі, але ён не прызнаўся! Вельмі крыўдна бачыць, як летувісы збіраюцца разам глядзець валейбол, ладзяць нацыянальныя вечарыны; актыўна праводзяць свае мерапрыемствы палякі ды ўкраінцы (у Брусэлі нават ёсць украінская крама), а мы, беларусы, нават сабрацца разам не можам!

“Офіс за дэмакратычную Беларусь” ахвотна запрашае маладых беларусаў на стажыроўку. “Нас цікавяць перадусім людзі, якія збіраюцца пазней вярнуцца на Радзіму альбо працаваць дзеля Беларусі. Краіне вельмі патрэбныя адукаваныя людзі”, – падкрэслівае Вольга Стужынская.

*Аляксандар Папко, Брусель*

## ПАГРОЗА АСНОЎНЫМ ПРАВАМ ЧАЛАВЕКА

**Новыя беларускія законы паграseverity асноўным правам чалавека.**

Эксперты ААН па правах чалавека перасцерагаюць, што нядаўна прынятыя Беларуссю змены ў заканадаўства, могуць сур’ёзна абмежаваць асноўныя грамадзянскія правы: свабоду асацыяцый, сходаў і слова.




У сумеснай заяве, зробленай трыма незалежнымі экспертамі ў Жэневе, падкрэсліваецца, што ўхваленыя Нацыянальным сходам Беларусі змены могуць яшчэ больш узмацніць “атмасферу страху і запалохвання” ў краіне.

Згодна з новымі правіламі, арганізацыя публічных мерапрыемстваў без папярэдняга дазволу ўладаў прызнаецца крымінальным злачынствам. Акрамя таго, арганізатары такіх мерапрыемстваў будуць абавязаны рыхтаваць справаздачы пра фінансаванне зладжаных імі мерапрыемстваў. Публічныя заклікі да правядзення сходаў і распаўсюджанне інфармацыі, у тым ліку і праз сацыяльныя сеткі і медыя-платформы пра акцыі, на якія не атрыманы дазвол, таксама забаронены.

Недзяржаўным арганізацыям (НДА) забараняецца захоўваць сродкі на рахунках за межамі Беларусі, у асобных выпадках крыміналізуецца таксама і атрыманне замежнай бязвыплатнай дапамогі.

Адмысловы дакладчык АНН па пытаннях права на свабоду мірных сходаў і права на асацыяцую Майна Кіаі, апісаў папраўкі як “непасрэдны замах на ажыццяўленне асноўных грамадзянскіх правоў, якія ляжаць у аснове любога дэмакратычнага грамадства”.

Ён адзначыў, што змены ў існуючыя законы, што рэгулююць дзейнасць грамадскіх арганізацый, палітычных партый, парадак правядзення масавых мерапрыемстваў, крымінальны і выбарчы кодэксы, праводзіліся без належных кансультацый з грамадзянскай супольнасцю.

**Франк Лару**, спецыяльны дакладчык ААН па пытанях свабоды слова і думкі, выказаў асаблівую заклапочанасць увядзеннем крымінальнай адказнасці за “правядзенне семінараў” і “распаўсюд агітацыйных матэрыялаў”.

Ён лічыць, што такія захады “падарвуць здольнасць усіх грамадзян распаўсюджваць інфармацыю і агучваць свае законныя прэтэнзіі і праблемы мірным шляхам”.

Эксперт ААН па справах парвраабаронцаў Маргарэт Секагія падкрэсліла, што апошнія павінны ажыццяўляць сваю дзейнасць без дадатковых перашкод, у тым ліку без абмежаванняў па фінансаванні.

"Калі праваабаронцам дазволена аб'ядноўвацца, але нельга шукаць, атрымліваць і выкарыстоўваць фінансавыя рэсурсы, права на свабоду аб'яднаняў робіцца несапраўдным», – сказала яна.

Эксперты выказалі занепакоенасць тым, што новыя папраўкі могуць быць выкарыстаны супарць кіраўніка праваабарончага сэнтру “Вясна” Алеся Бяляцкага, каторага вінавацяць ва ўхіленні ад выплаты падаткаў.

*un.org*

# ЗВАРОТ АМЕРЫКАНСКАГА КАНГРЭСМЭНА

**Старшыня Хэльсынскай камісіі прапануе ініцыяваць абвінавачаньні супраць Лукашэнкі ў Гаазе.**

Старшыня Хэльсынскай камісіі ЗША, кангрэсмэн **Крыстафэр Сьміт**, заявіў на слуханьнях камісіі ў справе Беларусі 15 лістапада, што зьвернецца да адміністрацыі прэзыдэнта ЗША з заклікам працаваць над тым, каб супраць Аляксандра Лукашэнкі вылучылі абвінавачаньні ў Міжнародным крымінальным судзе ў Гаазе. Крыстафэр Сьміт таксама назваў беларускі КДБ «вычварэнцамі».

Такія заявы Сьміт зрабіў пасьля выступленьня на слуханьнях былога кандыдата ў прэзыдэнты **Алеся Міхалевіча**, які расказаў пра фізычныя і маральныя зьдзекі зь вязьняў к турме КДБ у Менску – у прыватнасьці так званыя "расьцяжкі", вывад голымі на холад, доўгае стаяньне ля сьцяны амаль у шпагаце пагрозы, маральны ціск.

У інтэрвію Радыё Свабода кангрэсмэн Крыстафэр Сьміт патлумачыў сваю ініцыятыву: «Я шмат гадоў меў дачыненьне да судовага працэсу ў справе С'ера-Леонэ, і я зрабіў выснову з гэтага працэсу, з суду ў справе аб падзеях у Руандзе, і, вядома ж, з югаслаўскага суду, які прыцягнуў да адказнасьці Мілошавіча, Младзіча і Караджыча, што гэтыя галаварэзы баяцца магчымасьці быць прыцягнутымі да адказнасьці. Гэтага баяўся нават такі сумнавядомы чалавек, як [колішні кіраўнік Лібэрыі] Чарлз Тэйлар, пры якім дзяцям адразалі рукі і ногі, і людзей напампоўвалі наркотыкамі, каб яны рабілі зьверствы. І я лічу, што Лукашэнка таксама будзе баяцца, калі мы зробім сапраўды сур'ёзныя намаганьні прыцягнуць яго да адказнасьці ў Міжнародным крымінальным судзе. Беларусь, як дарэчы і ЗША, не падпісала статуту Міжнароднага крымінальнага суду, але мы ўсё роўна можа гэта зрабіць, бо гэта раней атрымалася з Башырам у Судане. Аднак трэба пачынаць гэтыя намаганьні ўжо цяпер».

Асноўнай тэмай слуханьняў было тое, як ўплывае перасьлед апазыцыі ў Беларусі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у сьнежні 2010 году на жыцьцё як саміх ахвяраў перасьледу, так і беларускага грамадзтва ў цэлым. Падчас слуханьняў Алесь Міхалевіч, у прыватнасьці, заявіў:

«Я абсалютна ўпэўнены, што Лукашэнка гатовы абараняць сваю ўладу ўсемі магчымымі сродкамі. Таму я заклікаю Злучаныя Штаты, Эўрапейскі Зьвяз і міжнародную супольнасьць ня верыць яшчэ адной гульні ў лібэралізацыю, у якую рэжым так кепска гуляе. Супрацоўнічаць варта з незалежнай грамадзянскай супольнасьцю ў Беларусі, зь недзяржаўнымі арганізацыямі, як незарэгістраванымі, гэтак і зарэгістраванымі, зь незалежнымі мэдыямі і дэмакратычнымі актывістамі».

*Радыё Свабода*

# У МІНСКУ ПРАЙШЛІ БЕЛАРУСКА-ГРЭЧАСКІЯ КАНСУЛЬТАЦЫІ ПАМІЖ МЗС

**14 лістапада ў Мінску прайшлі беларуска-грэчаскія кансультацыі паміж МЗС, паведаміла прэс-служба МЗС Беларусі.**

Беларускую дэлегацыю на мерапрыемстве ўзначальвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення Еўропы — начальнік упраўлення двухбаковага супрацоўніцтва МЗС **Сяргей Маліноўскі**, грэчаскую — начальнік Пятага дэпартамента Расіі, Беларусі, краін Закаўказзя і Чарнаморскага рэгіёну МЗС Грэцыі **Карлас Гадзіс**.

Як адзначыла прэс-служба, "у ходзе кансультацый, якія ў апошнія гады праводзяцца на рэгулярнай аснове, беларускія і грэчаскія дыпламаты абмяркуюць комплекс пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва, узаемадзеянне Беларусі з Еўрапейскім саюзам, у тым ліку ў рамках ініцыятывы "Усходняе партнёрства", АБСЕ, а таксама шэраг іншых тэм, што ўяўляюць узаемную цікавасць".

Паводле звестак МЗС, за студзень—верасень узаемны тавараабарот паміж Беларуссю і Грэцыяй павялічыўся ў 5,4 разы ў параўнанні з аналагічным перыядам 2010 года і дасягнуў 82,4 млн. долараў ЗША. Беларускі экспарт склаў 67,8 млн. долараў, імпарт — 14,6 млн. долараў. Сальда склалася станоўчае ў памеры 53,2 млн. долараў ЗША.

У Беларусі зарэгістравана 10 прадпрыемстваў з удзелам грэчаскага капіталу з агульным статутным фондам 230 тыс. долараў, у тым ліку шэсць СП і чатыры ІП са 100-працэнтным грэчаскім капіталам (аб'ём статутнага фонду ІП — 174,4 тыс. долараў ЗША).

За студзень—верасень 2011 года ў 4,4 разу ўзрасло ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам паступленне грэчаскіх інвестыцый, аб'ём якіх склаў 2,14 млн. долараў, у тым ліку прамыя інвестыцыі — 1,83 млн. долараў.

*БелаПАН*

**»РУХ у Еўропу»** - грамадска-палітычная газэта. Выдавец - Віцебская абласная арганізацыя ПАГА «Рух за Свабоду». Выдаецца нерэгулярна. Наклад - 299 асобнікаў. Рэдактар - Сяргей Салодкін. Вёрстка - Сяргей Солідны. Надрукавана на прыватным абсталяванні на свае сродкі і з дапамогаю адзінадумцаў. **http://kamunikat.org/ruch_u_europu.html**